УДК 94 (476)"1919/1922

# ДА ПЫТАННЯ ВЫВАЗУ АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ З ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1920 гг.

*Бароўская Вольга Мікалаеўна*
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле асвятляецца дзейнасць Камісіі па ацэнцы страт па вызначэнні матэрыяльнага і культурнага ўрону эканомікі Савецкай Беларусі ў 1921–1922 гг., у прыватнасці факту вывазу падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. архіўных рарытэтаў межавога архіва Мінскай губернскай чарцёжнай, архіва былога Губернскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей і маёмасці Мінскай вопытнай балотнай станцы.*

Наступствы і вынікі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. мелі негатыўны ўплыў для дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця тэрыторыі Беларусі. Вядзенне актыўных ваенных дзеянняў, акупацыйная палітыка польскіх улад, накіраваная на знішчэнне, разбаванне матэрыяльнага здабытку насельніцтва і тэрытарыяльных багаццяў, паланізацыю, ліквідацыю беларускамоўнай адукацыі і культуры, прывялі да скарачэння эканамічнага і людскога патэнцыялу беларускіх зямель, колькасці адукацыйных і прасветных устаноў.

Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. пачалося планамернае ўзнаўленне, а большасці выпадкаў і стварэнне наноў, большасці дзяржаўных, эканамічных і культурных структур. Дзеля таго, каб дакладна вызначыць памер разбурэння і ўрону, які быў нанесены Савецкай Беларусі падчас ваенных ліхалеццяў беларускім кіраўніцтвам былі створаны Камісія па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР (Камісія па ацэнцы страт), Беларускае таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі (ТСАІ). Акрамя ўнутрыпалітычнага аспекту дзейнасці гэтых структур, была і знешнепалітычная накіраванасць. У рамках працы Змешанай рээвакуацыйнай і спецыяльнай камісіі, створанай па рашэнням Рыжскага мірнага дагавора, польскі бок выставіў значна завышаныя патрабаванні па звароце рээвакуіраванай маёмасці і культурных артэфактаў, вывезеных з этнаграфічна польскіх зямель яшчэ падчас іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Іх прэтэнзіі распаўсюджваліся на спрэчныя аб'екты, тыпу Літоўскай Метрыкі, архіваў Мінскай вобласці. З мэтай супрацьпастаўлення гэтых маёмасных патрабаванняў як беларускі, так і ўкраінскі бакі пачалі збіраць падрабязны статыстычны матэрыял, які б яскравым чынам паказваў маштаб рабавання і вынішчэння тэрыторыі польскімі войскамі і акупацыйнымі ўладамі.

Ужо 27 студзеня 1919 г. пры НКЗС БССР быў створаны эканамічна-прававы аддзел, які збіраў матэрыялы аб зверствах польскіх акупантаў, такое ж даручэнне было дадзена наркаматам і мясцовым органам улады. 21 студзеня 1922 г. Пастановай СНК БССР была створана Спецыяльная камісія па ацэнцы страт, нанесеных дзеяннямі польскай арміі і акупацыйнымі польскімі ўладамі дзяржаве, прыватным асобам і ўстановам на тэрыторыі БССР (Камісія па ацэнцы страт). У склад Камісіі па ацэнцы страт уваходзілі прадстаўнікі (старшыні) ад цэнтральных ведамстваў БССР – Народнага камісарыята юстыцыі БССР, Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР, Народнага камісарыята земляробства БССР, Рабоча-сялянскай інспекцыі, Цэнтральнага статыстычнага таварыства. На чале камісіі стаяў глава статыстычнага ведамства БССР – М. І. Шкубер (1922–1927 гг.).

Камісія па ацэнцы страт складалася з Цэнтральнай камісіі, шасці павятовых камісій, якія ў сваю чаргу дзяліліся на сто шаснаццаць валасных камісій. Згодна з заданнямі Камісіі па ацэнцы страт, усе страты былі падзелены на некалькі ключавых груп. Першая вялікая група датычылася гарадоў: сюды ўключаліся ўсе страты, нанесеныя гаспадарцы ад разбурэнняў будынкаў, з-за адсутнасці рамонту (муніцыпальныя пабудовы, асабістыя дамы), ад ваеннага пастою. Другая група была разлічана на прамысловыя прадпрыемствы: тут знаходзіліся страты, нанесеныя з-за адсутнасці рамонту, ад невытворчага выкарыстання (перарасход вады), ад неатрымання даходаў ад вытворчасці прадпрыемстваў. Трэцяя група ўключала дарожныя страты (грунтавыя, маставыя, шасейныя, масты). У чацвёртую групу былі ўключаны агульнабюджэтныя страты гарадской і земскай гаспадаркі за 1914–1917 гг. (падзенне даходаў, расходы на ваенныя патрэбы, асігнаванні Усерасійскаму Саюзу гарадоў і Земскаму саюзу) [1, арк. 88–88 адв]. Акрамя гэтага, усе страты былі падзелены на дзве групы – тыя, якія былі нанесены польскімі войскамі і акупацыйныі ўладамі, і тыя, якія сталі вынікам бандыцкіх налётаў. У другую групу прапаноўвалася ўключыць страты, нанесеныя войскамі С. Н. Булак-Балаховіча, С. В. Пятлюры. У ходзе працы камісій па ацэнцы страт складаліся акты аб нанесеных стратах або згубах, абавязкова ў прысутнасці пацярпелага, сведак і экспертаў. У акце павінны былі пазначацца месца, дзе адбылося рабаванне, з дакладным вызначэннем вёскі, воласці, павета; прозвішча, імя пацярпелага, прычына нанесенай страты, дакладная назва прадметаў, іх колькасць у пудах ці іншых адзінках вымярэння, прыкладная сума страты ў рублях даваеннага часу [1, арк. 396].

Народны камісарыят замежных спраў РСФСР у шматлікіх інструкцыях і тэлеграмах, накіраваных на адрас Цэнтральнай камісіі па ацэнцы страт, раіў звярнуць большую ўвагу на страты, нанесеныя ў пагранічнай паласе. Справа ў тым, што гэтая тэрыторыя фактычна не падпарадкоўвалася савецкай уладзе. Да канца працы Змешанай пагранічнай камісіі (ліпень 1922 г.) на ёй знаходзіліся не толькі савецкія вайсковыя часткі, але і польскія фарміраванні. Камісія па ацэнцы страт павінна была правесці абследванне пагранічнай тэрыторыі на прадмет незаконнай вырубкі лясоў, ажыццяўлення рабаванняў [1, арк. 285]. Супрацоўнікам павятовых і валасных камісій прадпісвалася скласці акт па ацэнцы страт, куды ўносіліся прозвішча і імя пацярпелага, назва населенага пункта, прычына страты, дакладны пералік усіх рэквізаваных прадметаў (у адзінках вагі), прыкладная сума страты ў даваенных рублях [1, арк. 396]. Складзеныя акты па ацэнцы неабходна было накіроўваць ва Узгадняльную камісію па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў.

Падвесці вынікі працы Камісіі па ацэнцы страт удалося толькі ў жніўні 1922 г. Менавіта ў гэты час на адрас Народнага камісарыята замежных спраў паступіла справаздача камісіі, у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якой былі ўказаны ўсе лічбы, з пералікам на царскія, даваенныя рублі, керанкі. Так, па рэспубліцы страты складалі 9 млрд 34 млн 208 тыс. 319 савецкіх рублёў, або 52 млн 29 тыс. 281 залатых даваеных рублёў і 34 капейкі [1, арк. 365].

Аналагічную ролю выконвала і Беларускае таварыства садзейнічання ахвярам інтэрвенцыі (ТСАІ), якое было створана ў лютым 1924 г. Яго мэтай была абарона інтарэсаў грамадзян, якія пацярпелі падчас ваенных ліхалецццяў і прад'яўленне прэтэнзій краінам, якія ажыццяўлялі варожыя дзеянні ў адносінах да мірнага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі 1918–1922 гг. Праўленне таварыства ў 1924 г. праводзіла арганізацыйную працу па стварэнні павятовых і валасных камітэтаў. У кастрычніку 1927 г. быў ліквідаваны апарат таварыства і яго мясцовыя камітэты. 12 мая 1928 г. усе прэтэнзіі грамадзян былі перададзены Валютнаму ўпраўленню Народнага камісарыята фінансаў СССР. Праца Праўлення таварыства працягвалася да лютага 1932 г.

У ходзе працы Камісіі па ацэнцы страт за 1922 г. выявіўся факт вывазу польскімі войскамі архіўных матэрыялаў межавога архіва былой Мінскай губернскай чарцёжнай, архіва былога Губернскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей і маёмасці Мінскай вопытнай балотнай станцыі. Пры ацэнцы страт, звязанных з вывазам архіваў былой Мінскай губернскай чарцёжнай і ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей Камісія палажыла ў аснову кошт ўзнаўлення планаў вывезеных архіваў, а пры вызначэнні страт вопытнай балотнай станцыі фактычны кошт вывезенай маёмасці.

З межавога архіва Мінскай губернскай чарцёжнай было вывезена планаў на адзін мільён пятсот тысяч дзесяцін (1500 000) д.; з іх на адзін мільён двесці дзесяцін (1200 000) д. планы абмежавання сялянскіх надзелаў і трыста тысяч дзесяцін (300 000) д. планы землеўладкавання па закону 1906 г.; пры вызначэнні кошту страт, звязаных з вывазам вышэй указанага архіва Камісія, выслухаўшы меркаванне экспертаў, пастанавіла: лічыць кошт вытворчасці з'ёмкі адной дзесяціны пры абмежаванні сялянскіх надзелаў у адзін рубль да ваеннага кошту, а з'ёмкі адной дзесяціны пры землеўладкаванні па законе 1906 г. у тры рублі пяцьдзясят кап. Такім чынам агульная сума страт, звязаных з вывазам польскімі акупацыйнымі ўладамі межавога архіва Камісія вызначыла ў два мільёны пяцьдзясят тысяч рублей (2500 000 р.) золатам.

З архіва былога Упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей Мінскай губ. вывезена планаў: на былыя казённыя лясныя дачы на трыста тысяч дзесяцін, планаў прыватнаўладальніцкіх дач на адзін мільён двесці тысяч дзесяцін. Пры вызначэнні кошту страт, звязаных з вывазам вышэй указанага архіва Камісія выслухаўшы заключэнне экспертаў пастанавіла: лічыць кошт з'ёмкі адной дзесяціны ў такім выглядзе ў якім яна была нанесена на план: казенных дач у адзін рубль пяцьдзясят кап., а прыватных дач у пяцьдзясят кап. Такім чынам агульны кошт страт, звязаных з вывазам польскімі акупацыйнымі ўладамі былога ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей Камісія вызначыла ў адзін мільён пяцьдзясят тысяч рублей.

З маёмасці Мінскай вопытнай балотнай станцыі вывезена: бібліятэка колькасць кніг у дзве тысячы экзэмпляраў, лабараторыя і сельска-гаспадарчы музей. пры ацэнцы маёмасці Балотнай станцыі Камісія пагадзілася з ацэнкай яго персаналам вышэй указанай станцыі, якой вызначыў кошт маёмасці Балотнай станцыі ў дзесяць тысяч рублей (10 000 р.). Агульны кошт указанага ў сім маёмасці Камісія вызначыла ў тры мільёны трыста дзесяць тысяч рублей золатам, аб чым, а таксама аб сім вышэй выкладзеным складзены гэты акт у трох экзэмплярах [2, арк. 82–82 адв].

Прадстаўленыя прэтэнзіі беларускага боку былі агучаны старшынёй расійска-ўкраінскага боку на трэцім пасяджэнні Змешанай спецыяльнай камісіі. У выніку польскае кіраўніцтва вярнула ў Савецкую Беларусь 15 адзінак захоўвання архіўных матэрыялаў з ліку архіва былога ўпраўлення дзяржаўных маёмасцей Мінскай губ. На жаль, большая частка вывезеных дакументаў або загінула па дарозе, або так і засталася ў Польшчы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 9. Воп. 1. Спр. 1.
2. НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 1153.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова